Я ж сябе хваліць хацела
І пачну крыху нясмела…
Мае жыццёвыя дарогі,
Мой шлях цяжкі ў педагогі,
Выходзяць з той мясціны,
Дзе правяла найлепшыя часіны.
Пяць год у Мінску адвучылася
І ў школу родную вярнулася,
А ў сэрцы Мінск маім
Застаўся самым дарагім.
Цяпер працую я, вядома,
У школе, дзе да болю ўсё знаёма:
І кожны клас, і кожны кут,
Бо я вучылася вось тут,
А праца выпала не з лёгкіх,
Зусім не бачна мне палёгкі.
Над кожным вучнем я чарую,
І размаўляць дзяцей вучу я.
Люблю я і гасцей жа сустракаць,
Для іх смачную ежу гатаваць.
І кожны з іх дзівіцца:

- Як можна гэтым захапіцца?

Люблю я прыгажосцю любавацца,
З задавальненнем буду я займацца
Прыгожых кветак развядзеннем,
Раблю я гэта з захапленнем.
А як вазумяся я вязаць –
Ад гэтага не адарваць.
Выходзяць спрытна з-пад рукі
Кофты, шапкі, шарфы і “наскі”.

Цікава мне і вышываць,
Тканіну ніткамі размаляваць.
На ёй, то кветкі расцвітаюць,
То птушкі весела спяваюць.
Люблю я і паленавацца,
З кім-небудзь паспрачацца.
Бывае – не выканаць заданне,
Але не слухаць нараканне.
Мне ў міністэрства трапіць трэба,
Узнікла ў гэтым пэўная патрэба,
Бо маю па пытанню меркаванне.
Хачу я выказаць сваё жаданне.
Прапаную свае разважанні
Пра дэфекталагічнае навучанне.
Рэформы розныя бываюць,
Але навокал усе жадаюць
Дабіцца поспехаў станоўчых
І ўсе да гэтага імкнуцца моўчкі.
Спачатку створаны быў кабінет лагапедычны…
Горш у дзетак стала з навучаннем
І ўзнікла пэўнае жаданне –
Кабінет дэфекталагічны стварыць,
Каб навучанне лепшае ажыццявіць.
Прайшоў гадок. Ідзе рэформа.
Уводзіцца навучання новая форма –
Карэкцыя на першым месцы,
Адбываюцца змены і ў змесце.
Навінкі дайшлі і да нас –
Змяніць навучанне прыйшоў час:
Пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі

На службе дэфекталагічнай “стаў на ногі”.
Але жыве ў сэрцы адна мара,
Назойлівая, быццам дажджавая хмара:
Хочацца верыць, што прыйдзе імгненне –
І ў дзетак знікнуць моўныя парушэнні.
І разам знікне патрэба ў нас
Аказваць дапамогу скожны раз.
А мне прыйдзецца працаваць
І ў рыторыцы сябе паспрабаваць.
Усіх прыгожай мове навучаць,
Каб новую карысць ад гэтага трымаць…